# Хроніка

## ПІСЬМЕННІК – МОВА – СТЫЛЬ

Пад такой назвай 15–16 лістапада 2001 г. на філалагічным факультэце БДУ праводзілася II Міжнародная навуковая канферэнцыя, прысвечаная 75-годдзю з дня нараджэння прафесара Л.М. Шакуна, арганізатарам якой была кафедра гісторыі беларускай мовы універсітэта. Яе загадчыку доктару філалагічных навук М.Р. Прыгодзічу належыць асаблівая заслуга ў арганізацыі і паспяховым правядзенні гэтай навуковай імпрэзы.

На пленарным пасяджэнні з прывітальным словам да ўдзельнікаў канферэнцыі звярнуліся дэкан філалагічнага факультэта прафесар **Л.А. Мурына** і старшыня Рэспубліканскага Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны **А.М. Трусаў**. З цікавасцю выслухалі прысутныя ўспаміны дацэнта **В.В. Казловай** аб укладзе прафесара Л.М. Шакуна ва ўстанаўленне навуковых сувязей паміж БДУ і навучальнымі ўстановамі Германіі і Польшчы ("Л. Шакун як заснавальнік міжнародных філалагічных сувязей БДУ"). Агляд навуковай спадчыны вядомага беларускага лінгвіста зрабіў прафесар **У.М. Лазоўскі** ("Л.М. Шакун як мовазнаўца").

Філолагі з Германіі, Польшчы, Украіны, розных гарадоў Беларусі абмяркоўвалі навуковыя праблемы ў сямі секцыях: "Стыль і мова мастацкага твора", "Пісьменнік і мова", "Традыцыі і наватарства ў мове", "Беларускае пісьменства ў прасторы і часе", "Тэндэнцыі развіцця беларускага пісьменства", "Беларуская літаратура: ад старажытнасці да нашых дзён", "Методыка выкладання мовы і літаратуры". У аргкамітэт канферэнцыі было пададзена 140 дакладаў, у якіх узнімаліся значныя філалагічныя праблемы, прапаноўваліся шляхі іх вырашэння. Назавём некаторыя з іх:

"Чалавек (нацыянальная асоба) – мова – культура – аснова і мадэль міжкультурнага дыялога" – **Г.І. Басава і Ганс Аўэрсвальд** (Іена, Германія); "Словаўтваральныя варыянты якасных прыметнікаў у сучаснай беларускай мове" – **З.І. Бадзевіч** (Мінск); "Аўтарская пунктуацыя ў ранніх творах Я. Коласа" – **Ж.Я. Белакурская** (Мінск); "Паэзія А. Вялюгіна (індывідуальны стыль, асаблівасці паэтыкі)" – **А.І. Бельскі** (Мінск); "Тэарэтычныя асновы спецкурса "Беларуская антрапанімія перыяду першага адраджэння" – **І.А. Гапоненка** (Мінск); "Словаўтваральныя варыянты ў беларускай мове 20-х гг. XX ст." – **А.В. Губкіна** (Мінск); "Факультатыўнасць кампанентаў фразеалагізмаў" – **М.А. Даніловіч** (Гродна); "Реализация линейно-опережающего принципа в обучении синтаксису сложного предложения" – **А.Я. Долбік**; "Аб выкарыстанні «чэшскай мадэлі» ў гісторыі беларускага тэрміналагічнага будаўніцтва" – **С.М. Запрудскі** (Мінск); "Симметрия и асимметрия как универсальные категории языка" – **У.А. Карпаў** (Мінск); "Беларуская навуковая тэрміналогія: сучасны стан і перспектывы развіцця" – **В.П. Красней** (Мінск); "Да словаўтваральных сувязей слова *дар*" – **М.М. Круталевіч** (Мінск); "Аб прычынах складвання новай беларускай літаратурнай мовы на дыялектнай аснове" – **Г.І. Кулеш** (Мінск); "Пра мастацкае майстэрства Р. Барадуліна" – **І.Я. Лепешаў** (Гродна); "Біблейная канстанта ў стылёвай палітры У. Караткевіча" – **Е.А. Лявонава** (Мінск); "Параметры моўнай канцэнтрацыі ў фальклорных тэкстах (на матэрыяле беларускай і славацкай моў)" – **В.М. Ляшук** (Мінск); "Моўныя кантакты на сучасным этапе" – **Т.А. Мальцава** (Мінск); "Лінгвістычныя традыцыі на Беларусі (накід праграмы гісторыі беларускай лінгвістыкі па працах прафесара Л.М. Шакуна)" – **А.Я. Міхневіч** (Мінск); "Каларатывы ў творчасці У. Караткевіча" – **Д.Д. Паўлавец** (Гомель); "Назвы гаворачай асобы ў слоўніках Мікалая Байкова і Сцяпана Некрашэвіча" – **Ларыса Пісарэк** (Вроцлаў, Польшча); "Старабеларуская лексікаграфічная спадчына" – **Б.А. Плотнікаў** (Мінск); "Фёдар Галатузаў як даследчык беларускай мовы" – **М.Р. Прыгодзіч** (Мінск); "Фразеологизмы в творчестве Т. Шевченко" – **Э.Г. Пянькова** (Харкаў); "Сінтаксічныя аказіяналізмы (на матэрыяле беларускай драматургіі) – **В.І. Рагаўцоў** (Магілёў); "Метрыка і рытміка польскамоўнай творчасці Я. Лучыны (паводле зборніка "Poezje Jana Niesłuchowskiego". Мн., 1898) – **В.П. Рагойша** (Мінск); "Тэсты па марфалогіі ў сістэме практычных заняткаў па курсу гістарычнай граматыкі беларускай мовы" – **М.І. Свістунова** (Мінск); "Лексічныя архаізмы ў гаворках паўночнай Гайнаўшчыны" – **Базыль Сегень** (Беласток, Польшча); "Типовые группы вербоидов – реализаторы творческого замысла И. Бунина в романе "Жизнь Арсеньева" – **В.С. Сідарэц** (Мазыр); "Праблема стылёвага кансерватызму ў беларускай прозе XX стагоддзя" – **Л.Д. Сінькова** (Мінск); "Чешская социальная диалектология" – **Марціна Спадарэва** (Іена, Германія);



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

“Тыпы матывацыі беларускіх найменняў” – **В.П. Трайкоўская** (Мінск); “Праект падручніка беларускай мовы для немцаў” – **Соня Хайль** (Берлін, Германія); “Стылістычнае выкарыстанне амонімаў у беларускіх інтэрмедыях XVII ст.” – **Г.К. Ціванова** (Мінск); “Да праблемы стылю” – **І.Р. Шкраба** (Мінск); і інш.

Тэматыка навуковых дакладаў надзвычай разнастайная, але агульнае, што аб'ядноўвала іх аўтараў, – імкненне да ўсебаковасці асвятлення тэмы, аналітычнасці, прафесіяналізму. А гэта, як падкрэслівалі на заключным пасяджэнні канферэнцыі паплечнікі і шматлікія вучні прафесара Л.М. Шакуна, – найбольш дзейсны спосаб ушанавання памяці вядомага беларускага мовазнаўца, які ўсё сваё жыццё прысвяціў служэнню беларускай навуцы.

Тая акалічнасць, што навуковая канферэнцыя “Пісьменнік – мова – стыль” праводзіцца ўжо другі раз, сведчыць аб заснаванні добрай традыцыі, а ўдзел у ёй студэнтаў і аспірантаў разам з вядомымі даследчыкамі, якія маюць навуковыя ступені і вучоныя званні, дае надзею на захаванне гэтай традыцыі ў будучым.

*Г.І. Кулеш,*
кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры гісторыі беларускай мовы

## ДА ЎВАГІ ЧЫТАЧОЎ

Працягваецца падпіска на перыядычныя выданні на другое паўгоддзе 2002 года. Падпісная цана на часопіс “Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта” па серыях наступная:

**Серыя I** – фізіка, матэматыка, інфарматыка (№ 3, верасень):
індывідуальная (індэкс 74851) – 2 259 р.;
ведамасная (індэкс 748512) – 4 937 р.

**Серыя II** – хімія, біялогія, геаграфія (№ 3, кастрычнік):
індывідуальная (індэкс 74852) – 2 259 р.;
ведамасная (індэкс 748522) – 4 937 р.

**Серыя III** – гісторыя, філасофія, псіхалогія, палітaлогія, сацыялогія, эканоміка, права (№ 2, ліпень; № 3, лістапад):
індывідуальная (індэкс 74853) – 4 518 р.;
ведамасная (індэкс 748532) – 9 873 р.

**Серыя IV** – філалогія, журналістыка, педагогіка (№ 2, жнівень; № 3, снежань):
індывідуальная (індэкс 74854) – 4 518 р.;
ведамасная (індэкс 748542) – 9 873 р.

Падпісацца на часопіс “Веснік БДУ” можна ва ўсіх аддзяленнях сувязі Рэспублікі Беларусь.

*Рэдакцыя і рэдкалегіі часопіса*



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm